**Інстытут гісторыі**
**Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**

**Беларуская асацыяцыя гісторыкаў**

# Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць

**Навуковая канферэнцыя**

**(Мінск, 6–7 снежня 2001 г.)**

**Мінск**
**«Дэполіс»**
**2001**

УДК 946.7
Э 912

*Выданне ажыццёўлена пры фінансавай падтрымцы
Амерыканскага Яўрэйскага Аб`яднанага Размеркавальнага
Камітэта «Джойнт»*

Э 912 **Этнічныя** супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць
Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.) /
У.І. Навіцкі, М.С. Сташкевіч – Мн.: «Дэполіс», 2001. – 388 с.

Зборнік матэрыялаў навуковай канферэнцыі змяшчае даклады і паведамленні, прысвечаныя пытанням сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця этнічных супольнасцей, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі, а таксама гістарыяграфічныя агляды па асобных храналагічных перыядах гэтай праблемы.

Выданне будзе карыснае для навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў ВНУ, усіх, хто цікавіцца гісторыяй сваёй Бацькаўшчыны.

УДК 946.7

© Калектыў аўтараў

**Рэдакцыйная калегія:**

**Васілеўская Н.У.,**
кандыдат гістарычных навук

**Іофе Э.Р.,**
доктар гістарычных навук, прафесар

**Касцюк М.П.,**
акадэмік НАН Беларусі

**Калаткоў У.Я.,**
(рэдактар)

**Канапацкі І.Б.,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Ладысеў У.Ф.,**
доктар гістарычных навук, прафесар

**Лыч Л.М.,**
доктар гістарычных навук, прафесар

**Навіцкі У.І.,**
доктар гістарычных навук, прафесар (галоўны рэдактар)

**Мазец В.Г.,**
кандыдат гістарычных навук

**Раманава І.М.,**
кандыдат гістарычных навук

**Сташкевіч М.С.,**
доктар гістарычных навук, прафесар (намеснік галоўнага рэдактара)

**Тугай У.В.,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Ходар Н.В.,**

**Яноўская В.В.,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

складалася прыблізна з 70 твораў, была прадстаўлена з 16 па 28 студзеня 1977 г. у Дортмундзе.[3] Яна была заўважана нямецкай грамадскасцю і знайшла водгук у заходненямецкай прэсе, у прыватнасці ў газетах "Ruhr Nachrichten" („Рурскія паведамленні") і „Dortmunder Zeitung" („Дортмундская газета").

У 1980 г. актыўна ішла падрыхтоўка да Дзён Савецкага Саюза з удзелам БССР 1981 г. у Заходнім Берліне. З гэтай мэтай з 29 па 31 кастрычніка 1980 г. у СССР знаходзіўся намеснік старшыні Таварыства нямецка-савецкай дружбы Заходняга Берліна Ф.Румп. 29 кастрычніка ён наведаў Брэст, дзе прысутнічаў на канцэрце Брэсцкага народна-танцавальнага калектыву мастацкай самадзейнасці „Радасць", які планавалася паказаць у Заходнім Берліне на Днях 1981 г.[4] Ф.Румп застаўся задаволеным мастацкім узроўнем выканання праграмы канцэрта, рэквізітам ансамбля „Радасць" і выказаў упэўненасць, што калектыў брэсцкага ансамбля зробіць усё магчымае, каб ярчэй паказаць заходнеберлінскаму гледачу нацыянальныя беларускія танцы, песні і музыку. Да дзён 1981 г. з беларускага боку рыхтаваліся таксама народныя вырабы, графіка, фотавыстава і іншае.

Такім чынам, у 1965–1980 гг. даволі актыўна развіваліся разнабаковыя беларуска-нямецкія культурныя сувязі. Больш шчыльныя сувязі БССР мела з сацыялістычнай ГДР. Паміж гэтымі рэспублікамі адбываўся абмен аспірантамі і студэнтамі. У параўнанні з ФРГ, у ГДР перакладалася і выдавалася значна большая колькасць твораў беларускай літаратуры. У ФРГ, у сваю чаргу, актыўна даследавалася беларуская рэчаіснасць па лініі славістыкі.

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ:


1 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 914, воп. 4, спр. 162, арк. 41.
2 Баршчэўскі Л., Копанеў П. Гётэ ў бясконцасці часу // Гётэ Ё.-В. Выбраныя творы: Пер. з ням. Мн., 1999.
3 НАРБ, ф. 914, воп. 4, спр. 630, арк. 82–85.
4 НАРБ, ф. 914, воп. 4, спр. 707, арк. 37.


*Вялікі А.Ф. (Мінск)*

# ПАЛЯКІ Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ: «ДВАІСТЫЯ СТАНДАРТЫ» НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ КПБ (1944—1991 гг.)

Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў прывяло да значных тэрытарыяльных змен і ўсталявання новых меж у шэрагу краін Усходняй Еўропы. Гэтыя змяненні непасрэдна закранулі Беларусь, якая межавала з ужо новай Польшчай – пракамуністычнай і прасавецкай, трапіўшай у сферу ўплыву Масквы. Новыя ўзаемаадносіны з Польшчай, а таксама тое, што на захадзе Беларусі жыла значная колькасць палякаў, далёка не сімпатызаваўшых камуністычнаму рэжыму, клапацілі як кіраўніцтва ВКП(б), так





і КП(б)Б. Вышэйшае палітычнае кіраўніцтва краіны літаральна праз некалькі месяцаў пасля вызвалення Беларусі вызначыла сваё стаўленне і адносіны да палякаў заходняга рэгіёна рэспублікі на бліжэйшую перспектыву.

20 студзеня 1945 г. ЦК ВКП(б) прыняў пастанову «Аб палітычнай працы партыйных арганізацый сярод насельніцтва заходніх абласцей БССР», якая вызначыла стратэгію паводзін КП(б)Б адносна палякаў амаль да канца 1940-х гг. Кампартыі Беларусі рэкамендавалася «З улікам мясцовых асаблівасцей выкарыстоўваць усе сродкі, якія маюцца ў іх распараджэнні». ЦК ВКП(б), са свайго боку, абавязаўся «Аказваць ім (партыйным органам Беларусі – А.В.) неабходную дапамогу».[1]

Сутнасць пастановы магчыма звесці да двух тэзісаў: «саветызацыя» і «выцясненне» ўсяго польскага з духоўнага, культурнага, рэлігійнага жыцця палякаў. Пастанова прадугледжвала значнае ўзмацненне агітацыйна-прапагандысцкай працы; паляпшэнне якасці рэспубліканскіх і абласных газет; спецыяльна для агітатараў, працаваўшых у заходніх абласцях, прадуглежваўся дадатковы выпуск (два разы на месяц) часопіса «Блакнот агітатара». Вельмі важная роля ў перавыхаванні польскага насельніцтва адводзілася сярэдняй школе і настаўнікам. Планавалася перавыданне падручнікаў на беларускай і рускай мовах, перападрыхтоўка настаўнікаў. Акрамя гэтага, ЦК ВКП(б) абавязаў Наркамасветы РСФСР «З 1 сакавіка па 1 жніўня 1945 г. адкамандзіраваць для працы ў школах заходніх абласцей Беларусі ўсіх раней эвакуіраваных з БССР настаўнікаў-беларусаў, працуючых у школах РСФСР». Дзяржвыдавецтву РСФСР загадвалася да новага вучэбнага года надрукаваць 1 млн. экземпляраў беларускіх падручнікаў.[2]

Выконваючы гэтую пастанову, ЦК КП(б)Б «пайшоў» значна далей. 17 красавіка 1945 г. ЦК КП(б)Б сумесна с СНК БССР прынялі пастанову «Аб мерах дапамогі школам заходніх абласцей БССР», якая прадугледжвала радыкальныя змяненні ў сістэме падрыхтоўкі педагагічных кадраў, забеспячэнні школ вучэбнай, вучэбна-метадычнай літаратурай, паляпшэнні кіраўніцтва вучэбнай і палітыка-выхаваўчай працай і г.д.[3]

У мэтах вырашэння толькі «кадравага» пытання ЦК КП(б)Б абавязаў Наркамасветы, Мінскі, Бабруйскі, Магілёўскі, Гомельскі абкамы КП(б)Б і аблвыканкамы на працягу мая адкамандзіраваць на працу ў школы заходніх абласцей 400 настаўнікаў; накіраваць у школы 800 настаўнікаў з ліку заканчваючых педвучэльні ўсходніх абласцей і 200 – заканчваючых педВНУ; накіраваць у гэтыя вобласці з ліку рээвакуіруемых 1 тысячу настаўнікаў і асноўную частку настаўнікаў, дэмабілізуемых з РСЧА».[4]

Пры гэтым ні ў адной з названых пастаноў не ўзгадвалася пра палякаў. У чым жа тады праявіліся «двaістыя стандарты» КП(б)Б у адносінах да палякаў? Тое, што не знайшло адлюстраванне ў пастановах, прызначаных для друку, захоўвалася ў рашэннях, схаваных пад грыфам «сакрэтна».

Красамоўным прыкладам гэтага з'явілася дакладная запіска першага сакратара ЦК КП(б)Б М.Гусарава «Аб стане і мерах па паляпшэнні палітычнай працы сярод апалячанага беларускага насельніцтва і насельніцтва польскай нацыянальнасці ў заходніх абласцях БССР», накіраваная ў ліпені

Беларусі ўсталёўваць кантакты з памежнымі ваяводствамі Польшчы. Гэтыя кантакты ажыццяўляліся пераважна па лініі грамадскіх аб'яднанняў і партыйных органаў. Пашырэнню і паглыбленню такіх кантактаў павінна было садзейнічаць Беларускае аддзяленне Таварыства савецка-польскага сяброўства, адкрытае ў 1958 г. і меўшае свае філіі ў розных гарадах Беларусі. Аднак яго дзейнасць, як і пашыраныя двухбаковыя абмены рознымі дэлегацыямі партыйнымі, прафсаюзнымі, спартыўнымі, маладзёвымі і іншымі – жорстка кантраляваліся ЦК партыі. Кантроль заключаўся ў тым, што на бюро ЦК КПБ заўсёды ўзгадняліся планы прыему дэлегацый, месцы наведвання і сустрэч і г.д. Напрыклад, у 1958 г. бюро ЦК КПБ 14 разоў разглядала пытанні аб накіраванні беларускіх дэлегацый у Польшчу і прыёме польскіх у Беларусі.

Разам з двухбаковым абменам у Беларусі рэгулярна праводзіліся дні польскай культуры ( у 1958, 1964, 1972, 1976 гг.), якія праходзілі таксама фармалізавана і па загадзя складзеных і «адпрацаваных» планах. Так, падчас правядзення першых дзён польскай культуры ў Беларусі ў 1958 г. «Адбыліся сустрэчы польскіх гасцей з беларускімі пісьменнікамі, мастакамі, кампазітарамі, дзеячамі культуры» і г.д.[13] Але не адбывалася і не магло адбыцца незапланаваных сустрэч з палякамі Гродзеншчыны, Берасцейшчыны, на якіх бы абмяркоўваліся пытанні культурнага, рэлігійнага, навуковага жыцця палякаў Беларусі. Па такім жа сцэнары праходзілі і наступныя дні польскай культуры ў Беларусі.

Змяненні ў адносінах да палякаў, як нацыянальнай меншасці, адбыліся ў другой палове 1980-х гг., калі грамадства пачало вызваляцца з-пад прэса КПБ. Так, у 1987/1988 г. вучні Ласоснаўскай СШ Гродзенскага раёна пачалі факультатыўна вывучаць польскую мову. У 1989/90 навучальным годзе ў СШ № 3 і № 23 Гродна прайшоў набор вучняў у два класы, дзе навучанне вялося толькі папольску.[14] Новы этап у жыцці палякаў, як нацыянальнай меншасці, пачаўся з 1991 г., пасля забароны дзейнасці структур КПСС–КПБ на тэрыторыі Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ:

1 КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК КПСС. Т.7. 1938–1945. М., 1985. С. 533.
2 Там сама. С. 533–536.
3 Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 3. 1933–1945. Мн., 1985. С. 528.
4 Там сама. С. 529.
5 НА РБ, ф. 4, воп. 29, спр. 543, арк. 40.
6Там сама, арк. 48.
7 Там сама, арк. 42.
8 Там сама, арк. 43.
9 Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях ... Т. 4. 1945–1955. С. 161.
10 Там сама. С. 182.
11 Там сама. Т. 6. 1966–1975. С. 93–99.
12 Падлічана аўтарам па матэрыялах НА РБ, ф. 4, воп. 93, спр. 118, 136, 241, 246, 252, 257, 264, 279, 284, 289, 294.
13 Толстой В. Братское сотрудничество белорусского и польского народов. Мн., 1966. С. 83.





14 Калацей М., Улейчик Н. Национальное образование и национальные меньшинства на Гродненщине в конце 80-х годов 20 ст. // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі 5–6 снежня 1997 г. Гродна, 1998. С. 305.

*Мисиюк В.С. (Брест)*

# ПРОБЛЕМЫ ИССЛЕДОВАНИЯ ЭКОНОМИЧЕСКОГО И КУЛЬТУРНОГО ПОЛОЖЕНИЯ БЕЛОРУССКОГО, УКРАИНСКОГО И РУССКОГО НАСЕЛЕНИЯ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ (1921—1939 гг.)

Указанная тема недостаточно освещена в отечественной историографии. Так, например, существование национальной кооперации в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. не отмечено в «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Однако наиболее неисследованными сторонами остаются черты, характеризующие специфику экономического уклада Западной Беларуси, деятельность в регионе национальной интеллигенции.

Детальной проработки и анализа требуют следующие проблемы: вопервых, как определить состояние экономического уклада Западной Беларуси, к какому типу хозяйствования его отнести? Во-вторых, как объяснить специфическую связь функционирования национальных институтов с результатами выборов? С каким из факторов следует соотнести размытость этнического самосознания и специфического подхода в просвещении? Специфичным является непредпринимательский характер национальных экономических организаций. Предположим, что экономический и культурный быт Западной Беларуси имел свой отдельный характер. Попробуем проиллюстрировать это на примерах.

Экономический уклад Западной Беларуси характеризовался существованием ряда пережитков натурального хозяйства. Урожаи в регионе были самые низкие в Польше. В Полесском, Новогрудском и Виленском воеводствах под полями использовалось 33,4% земель. Около 50% их принадлежало помещикам. Применение техники было чрезвычайно низким. В сельском хозяйстве не развитыми оставались товарно-денежные отношения: на 100 занятых здесь человек лишь 5,3 были наемными работниками, а в Полесском воеводстве – всего 1,5 чел. Сильны оставались элементы натурального хозяйства: собственный табак, использование лучин, кресал, отсутствие угля как отопительного сырья, в некоторых местностях Полесского воеводства и натуральный обмен. Главным стимулом товарно-денежных отношений оставались налоги, а не поиск прибыли. Единственным индикатором связи с общегосударственным товарным рынком оставалась соль.

Средняя недельная заработная плата в Западной Беларуси на всем протяжении существования межвоенной Польши была в 2 раза ниже в сравнении с промышленными центрами западных регионов страны (14,76 злотых в 1933 г. в Новогрудском воеводстве): "Продукты первой необходимости, как